Жаночыя лёсы

Яўген Хвалей

# А НА БЕРАЗЕ ТЫМ...

Раман

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2021

УДК 821.161.1(476)-3
ББК 84(4Беи)6-44
Х-30

*Серыя заснавана ў 2019 годзе*

**Хвалей, Я. І.**

Х-30 А на беразе тым… : раман / Яўген Хвалей. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2021. — 160 с. — (Серыя «Жаночыя лёсы»).

ISBN 978-985-581-425-3.

У рамане «А на беразе тым…» паказаны няпростыя жаночыя лёсы. У цэнтры — зусім маладая жанчына, якая шукае сваё шчасце за мяжой на востраве Крыт, і другая, ужо добра выпрабаваная жыццём, сустракае — ажно праз трыццаць гадоў — былое першае каханне і… Што чакае іх абедзвюх наперадзе…

**УДК 821.161.1(476)-3**
**ББК 84(4Беи)6-44**

**ISBN 978-985-581-425-3**

© Хвалей Я. І., 2021
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2021

# І. ЛОЎЧЫЯ РАЙСКАЙ ПТУШКІ

## Частка першая
## ПАЛЯВАННЕ НА ЗАМЕЖНАГА ЖАНІХА

### АДЛЁТ НА КРЫТ

«Боінг» адарваўся ад узлётнай паласы, набіраючы вышыню і хуткасць, узяў курс на поўдзень. У салоне самалёта яны сядзелі побач: муж і жонка Забярэжныя, Ян Пятровіч і Вольга Міхайлаўна, іх пляменніца Ала. Сваякі ляцелі на востраў Крыт, дзе жыла дачка нашай сямейнай пары — Ірына. Праз тыдзень у яе вяселле, выходзіць замуж за грэка, жыхара Крыта.

— Ой, як у вушах трашчала падчас узлёту! — зморшчылася Ала, калі «боінг» нарэшце выйшаў на неабходную вышыню.

— А мне заклала вушы, усё роўна, як ватай заткнулі, — сказала Вольга Міхайлаўна, зручней сядаючы ў крэсле.

— А некаторыя, я чуў, знарок затыкаюць вушы, каб часам не лопнулі перапонкі ад узлётнай напругі, — умяшаўся ў гаворку Ян Пятровіч. Ён сядзеў каля ілюмінатара і любаваўся прыгажосцю аблокаў. — Глядзіце, якая карціна! Воблакі — што ўзбітыя пуховыя падушкі. А на сонца не глянуць! Слепіць...

Жанчыны асцярожна, на імгненне нахіліліся да ілюмінатара, глянулі, быццам баючыся, і зноў прыліплі да сваіх крэслаў. Забярэжны працягваў углядацца ў неба.

Быў жнівень, другая яго палова. Лета кацілася на спад. Над роднымі палеткамі, калі самалёт выскокваў з-за аблокаў на святлістую прастору, Ян Пятровіч бачыў зжатыя квадраты і прамавугольнікі — з вышыні яны сапраўды нагадвалі геаметрычныя фігуры — збажыны. Роўнымі радамі, як тое золата, ляжалі жоўтыя рулоны саломы. «Прыгожая наша зямля, які час не бяры, — падумаў Забярэжны. — І чаго некаторым людзям так карціць пакінуць яе, збегчы за мяжу — не разумею...

Ну хоць бы наша дачка Ірына. Магла ж і тут, дома, выйсці замуж. Не, трэба ўцячы ў такую далячынь, у чужую краіну...»

Лайнер штохвілінна скарачаў адлегласць, пасажыры хто ўжо драмаў, а хто чытаў газеты. Камандзір карабля падаграваў аб'явамі:

— Пралятаем над Крымам...

— Унізе пад намі — Чорнае мора...

— Турцыя...

— Паказалася Міжземнаморскае ўзбярэжжа... Праз паўгадзіны прызямляемся ў аэрапорце вострава Крыт…

Забярэжныя і Ала — яны ляцелі першы раз на Крыт — успрымалі яго словы з асаблівым хваляваннем. Не жартачкі, за нейкія тры гадзіны з гакам праляцець над Беларуссю, Украінай, Турцыяй, над двума морамі... А прызямляцца давядзецца на востраве ў Міжземным моры. Якія яны, тыя Крыт і мора?

Ян Пятровіч быў родам з наднёманскай вёскі Кужалі. Яго жонка і пляменніца Ала — мінчане. Яму, панямонцу, добра вядома, што такое жыць каля вады, калі напрадвесні пойма Нёмана разліваецца на цэлыя вёрсты. Забярэжны часта згадваў першыя словы яго любімага рамана Івана Мележа «Людзі на балоце»: «Хаты былі на востраве». «Цікава, якія дамы на Крыце?» Дачка крыху расказвала, што там усё не так, як у Беларусі. «Прыляціш, бацька, усё сам паглядзіш... Крыт — гэта супер!» Што там за «супер» — хутка пабачыць на свае вочы. А пакуль Забярэжны, жонка і Ала пілі апельсінавы сок, які падала бортправадніца. Неўзабаве па салоне паплыла цялежка з абедам.

— Дык нічога сабе частуюць тут, у самалёце, — прамовіў Забярэжны, жуючы смажаную курыцу... — Я згадзіўся б кожны дзень гэтак лятаць... — усміхнуўся.

— Табе каб толькі паесці — няважна дзе... — не падтрымала яго жарт жонка. — Палучак тваіх не хопіць на такія палёты...

— А што, маёй кандыдацкай зарплаты мала?

— Ды і няшмат... Па сабе ведаю... У мяне такая ж зарплата...

Справа ў тым, што Забярэжныя абое былі вучоныя. Ян Пятровіч — эканаміст, яго жонка — хімік. Ён выкладаў ва ўніверсітэце, яна працавала ў Акадэміі навук.

— Ціха, тут жа і замежцы ляцяць — не толькі нашы, — спыніла іх спрэчку Ала.

Забярэжны прынік да ілюмінатара і замоўк. Глянуў уніз: усюды мора, вада, хоць бы дзе кусцік, дрэўца ці астравок. Але неўзабаве паказаўся жоўты бераг.

Урэшце позірк прыцягнулі пабудовы набярэжнай. Паплылі домікі, якія здаваліся цацачнымі.

— Увага! Прызямляемся… — прагучала ў салоне.

«Боінг» мякка прабег па бетоннай паласе. Адно злёгку страсянула, калі колы шассі крануліся зямлі. Гэта добра адчулі і нашы героі. Прайшло няшмат часу, пакуль сціхлі рухавікі, і пасажыры пачалі выходзіць з самалёта: спускаліся з трапа і накіроўваліся ў бок будынка аэрапорта.

Праверка дакументаў, атрыманне сумак, валізак, мытня занялі нейкія паўгадзіны. І калі здарожаная тройца выйшла ў залу, дзе сустракалі авіяпасажыраў, раптам з натоўпу да іх кінуліся Ірына і Нікас, яе будучы муж. Абняліся, пацалаваліся, расчулена загаварылі... На вуліцы каля аэрапорта іх чакала машына. Хутка ўсе селі ў яе, месца за рулём заняў Нікас. У дарозе ён маўчаў, бо дрэнна размаўляў па-нашаму.

Машына бегла па шырокім аўтабане. Абодва бакі руху былі адгароджаны высокай жалезнай перагародкай. Паабапал дарогі цвілі рознакаляровыя кусты і кветкі, якіх не пабачыш у Беларусі. Жанчыны не маглі нагаварыцца, трашчалі, як сарокі, а Ян Пятровіч, седзячы каля акна, разглядваў тутэйшую прыроду. Яркія кветкі і кусты, якія аж гарэлі на сонцы, бурая зямля, як наша гліна, ружаватыя скалы, што сям-там навісалі над аўтабанам, здзіўлялі Забярэжнага. «Непадобная, зусім не падобная прырода Крыта на нашу, — пранеслася ў думках. — Можа, таму што сам востраў некалі ўтварыўся ў выніку землятрусу ці вывяржэння вулкана. Проста падняўся са дна мора. Так казала дачка». Забярэжны глядзеў не толькі на крыцкія ландшафты, але і на няспынныя патокі машын, якія імчалі па шашы. «Легкавушкі розных замежных марак — ад “пежо”, “фордаў”, “таётаў” да “мерседэсаў”. І ніводнай нашай маркі. Ну хоць бы “Волга”. А дзе аўтобусы ды розныя маршруткі? Не відаць...»

Ён не ведаў, што на Крыце адсутнічае грамадскі транспарт — няма аўтобусаў, тралейбусаў, трамваяў, цягнікоў. Усе ездзяць на ўласных аўтамабілях. Вось так і ў яго будучых крыцкіх сваякоў. У сям'і зяця бацька ездзіць на паўгрузавой японскай «міцубісі», зяць — на «фордзе», яго брат — на «аўдзі».

Некалькі дзясяткаў кіламетраў — такая адлегласць ад аэрапорта да Іракліёна, сталіцы Крыта, — праехалі хутка. Уехалі ў горад — і адразу трапілі ў затор: машыны паўзлі адна за адной, як чарапахі, а то і зусім спыняліся, стаялі, як укапаныя. Забярэжны тым часам разглядаў вуліцу, дамы, якія яму здаліся нізкімі, — большасць пяціпавярховыя. Але кожны не падобны на іншы. Недзе ён вычытаў, што на астравах звычайна дамы нізкія — з-за высокай сейсмічнасці.

Іх «форд», павольна прасоўваючыся ў бясконцым патоку машын, урэшце спыніўся каля невялікага белага двухпавярховіка. Гэта быў дом будучага свата Забярэжнага. Госці павыходзілі з машыны і адразу трапілі ў абдымкі: на іх проста накінулася Віка са сваімі дзецьмі — шасцігадовай дачушкай і трохгадовым сынам. Віка — лепшая школьная сяброўка Ірыны. Яна прыляцела з іспанскай Барселоны. Там яна выйшла замуж за каталонца. Ян Пятровіч не паспеў як след разгледзець дом, бо пасля гарачых абдымкаў Вікі трэба было знаёміцца з будучымі сваякамі-крытчанамі. Тыя стаялі пад паветкай, тут жа месціўся стол з рознымі напоямі і ежай. Побач расло ўсыпанае жоўтымі пладамі лімоннае дрэва. На ім вісеў плакат са словамі, напісанымі па-грэчаску: «Калос ірфэс!» (Сардэчна запрашаем!) Пачалося знаёмства.

— Маноліс — патэра (бацька) Нікаса.

— Марыя — мітэра (маці).

— Міхаліс — адэльфос (брат) Нікаса...

Усе падавалі па чарзе руку, называлі сябе... Мужчыны-астравічане шчыра ўсміхаліся, адна Марыя — сухенькая, маленькая жанчына са зморшчынамі на твары — маўчала. Забярэжнаму яна не спадабалася, а вось мужчыны — малайцы! Шырокія сонечныя ўсмешкі, асабліва Маноліса, выклікалі давер. Забярэжны нават бліжэй стаў каля Маноліса — як-ніяк

будучы сват. Прыцягваў увагу яго тонкі доўгі нос — зусім не класічны грэчаскі. У Наднямонні казалі: нос, як у куліка. Сын Маноліса Міхаліс здаўся светлым і добрым чалавекам — ён бесперастанку ўсміхаўся, нешта па-свойму гаварыў.

Маноліс запрасіў усіх за стол. Налілі ў келіхі чырвонага іскрыстага віна. Тостаў тут не кажуць, толькі чокнуліся за ўдалы прылёт гасцей, выпілі крыху. П'юць таксама не так, як у нас: пацягваюць напой невялікімі глыткамі — ці гэта віно, віскі або піва. Гарэлку лічаць чужым напоем. Калі Забярэжныя дасталі прыгожыя сувенірныя бутэлькі гарэлкі, дык іх Міхаліс тут жа занёс у пакой і паставіў на паліцу, на якой ужо красавалася шмат такіх бутэлек — цэлая выстава.

Пасля пачастунку весялей загаманілі, хто па-нашаму, хто па-грэчаску. Ірына, будучая нявеста, паспела збольшага вывучыць грэчаскую мову, таму была сямейным перакладчыкам.

— Ці канэтэ Мінск? (Як у вас справы ў Мінску?)

— Вельмі добра (Полі кала). А ў вас? (Кэ эсіс?)

— Эфхарысто! Кала! (Дзякуй! Добра!)

Ірына перакладала, і гамонка ішла так, нібыта ўсе размаўлялі на адной мове. У канцы дамовіліся — да вяселля заставаўся яшчэ тыдзень — паехаць адпачыць на мора. На гэтым і спыніліся, выйшлі з-за стала пад паветкай і рушылі ў дом — мінчукі з падарункамі, ад якіх аж трашчалі валізкі і сумкі. Там іх распакуюць і ўручаць падарункі гаспадарам.

## ІРЫНА — ІНА — НІКАС

(*Партрэты ў анфас і профіль*)

Ірына была другой дачкой у сям'і Забярэжных. У адрозненне ад старэйшай Святланы, ціхмянай русявай дзяўчыны, якая выдатна вучылася ў школе, Ірына, чарняўка, з шырокай белазубай усмешкай, была супрацьлегласцю сястры. Яна мала ўвагі ўдзяляла вучобе, часта атрымлівала не вельмі высокія адзнакі. Так працягвалася да дзявятага класа. Тут перад ёю паўстаў выбар: ці працягваць вучобу ў школе, ці спыніцца на якім-небудзь вучылішчы або тэхнікуме. Перамагло апошняе.

На той час у паліграфічным каледжы адкрылася аддзяленне камп'ютарнага набору. Ірыне падабаўся камп'ютар. Праўда, дома яго не было. Хадзіла з сяброўкай у інтэрнэт-клуб, дзе праседжвалі гадзінамі. У каледж Ірына паступіла адразу, здаўшы адзін экзамен па матэматыцы. Тут яна пасябравала з Інай, дзяўчынай старэйшай за яе на два гады. О, гэтая Іна! Калі б не яна, магчыма, і лёс Ірыны склаўся б зусім інакш...

Ірына зблізілася з Інай пасля здачы ўступнага экзамена. Выйшлі разам з аўдыторыі. На вуліцы Іна дастала цыгарэты, закурыла, потым прапанавала закурыць Ірыне. У маладых гэта называецца «зняць стрэс». І хоць Ірына дасюль не курыла, але цыгарэту ўзяла.

— Будзем знаёмы. Мяне зваць Іна. А цябе?

— Ірына.

— Выкінь «ры» — і будзем дзве Іны. І Бог наказваў нам сябраваць. Пайшлі развеемся па «Брадвею», — Іна так называла самы шырокі праспект сталіцы.

Новыя сяброўкі дайшлі пешшу ад Камароўскага рынка да вакзала, перагаварылі пра ўсё, што можна. На вуліцы Дружная развіталіся. Іна села ў свой аўтобус, які павёз яе ў бок Грушаўкі, дзе яна жыла, а Ірына рушыла ў метро — ёй патрэбна было ў Зялёны Луг.

У каледжы прабеглі два з паловай гады вучобы. Ірына і Іна так пасябравалі, узаемна прыкіпелі, што хутка адна без другой не маглі жыць. Іна была ва ўсім завадатарам. Яны глядзелі розныя фільмы, наведвалі бары і дыскатэкі. Былі не толькі адна ў адной дома ў горадзе, але і на радзіме бацькі Ірыны — на Нёмане. Там, у лесе, здарылася непрыемнае.

У той дзень пакрочылі яны разам з бацькамі ў чарніцы.

Зайшлі даволі глыбока ў лес, чарніц было шмат, сапраўдны неруш. Збіралі да стомы, і раптам пачулі ціхі стогн Іны:

— Ой, я паміраю! Ратуйце!..

Падбеглі Ірына, бацькі. Іна ляжала на ягадніку белая, як мел. Паднялі, далі лякарства, якое брала з сабой Вольга Міхайлаўна. Іна крыху ачуняла. Ледзь пасля прыйшлі дамоў. Пазней высветліцца прычына недамагання Іны: яна была на другім месяцы цяжарнасці.



***Яўген Іванавіч Хвалей*** *нарадзіўся 1 студзеня 1947 г. у вёсцы Белькаўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і калгаснікаў. Скончыў Мікалаеўшчынскую сярэднюю школу імя Якуба Коласа (1965), філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971).*

*Працаваў дырэктарам Мінскага абласнога Дома народнай творчасці (1972–1975), на Беларускім радыё і тэлебачанні (1976–1985), у выдавецтвах «Народная асвета» (1972), «Юнацтва» (1985–2002), «Мастацкая літаратура» (2002), часопісах «Крыніца» (2003), «Родная прырода» (2005–2006), газеце «Літаратура і мастацтва» (2004).*

*Аўтар паэтычных кніг «Ярына» (1979), «Прычасце» (1983), «Зялёны прамень аеру» (1987), «Квадры памяці» (1992), «Прыстань віцінаў» (1996), «Дзе хвалі срэбна-залатыя» (2009), «Маёнтак» (2018), зборніка гумарыстычных вершаў «Год Парсюка» (2019); кніг прозы: аповесцей «Пацукі» (1990), «Прынцэса тусоўкі» (2000, 2008, 2012, 2017), «Анжэла з Былькаў» (2012), «Вяселле на Кіпры» (2012), «Не пакідай мяне, Аля» (2016), «Нож» (2020); рамана «Серабрыстыя таполі» (2015).*

*Выдаў зборнікі вершаў і казак для дзяцей «Насціны гасціны» (1989), «Каця на планеце радапедаў» (1997), «Дзіва-сны дзяўчынкі Вікі» (2002), «Яблык з радзімкай» (2017).*

*Укладальнік шматлікіх вершаваных зборнікаў: «Якуб Колас. Вершы» (1987), «Родныя вобразы» (1998), «Анталогія беларускага санета» (2002), «Бацька наш Нёман» (2001) і інш.*

*Аўтар шэрагу тэкстаў песень, радыйных і тэлевізійных пастановак.*

*Лаўрэат рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2012). Уладальнік нагруднага знака «За вялікі ўклад у літаратуру» (2015).*

*Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1989 г., яго ганаровы сябра з 2017 г.*

*Жыве ў г. Мінску.*

## Змест


**I. ЛОЎЧЫЯ РАЙСКАЙ ПТУШКІ**

*Частка першая.*
ПАЛЯВАННЕ НА ЗАМЕЖНАГА ЖАНІХА . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
АДЛЁТ НА КРЫТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
ІРЫНА — ІНА — НІКАС (*Партрэты ў анфас і профіль*) . . . . 7
АЛА (*Партрэт у поўны рост*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
ПРЫЛЁТ ІНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
ТЫДЗЕНЬ НА МОРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
ВЯСЕЛЛЕ ПА-КРЫЦКУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*Частка другая.*
«ЗАРУЧЫНЫ» АЛЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
ЗАГАДКІ... РАЗГАДКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
ДЗЁРЗКАСЦЬ І РЫЗЫКА ІНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
ГРОМ СЯРОД ЯСНАГА НЕБА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
НОВАЕ ПАЛЯВАННЕ АЛЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
ПЕРАД ЗВАРОТАМ ГАСЦЕЙ У МІНСК . . . . . . . . . . . . . . 49
НЕЧАКАНАЕ ПРЫЗНАННЕ МІХАЛІСА . . . . . . . . . . . . . . 52
ПАСТСКРЫПТУМ. ПРАЗ ГОД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

**II. НЕЗАБУДКА СЭРЦА**

САРДЭЧНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
НЕЗАБУДКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
СУСТРЭЧА ПРАЗ ТРЫЦЦАЦЬ ГАДОЎ . . . . . . . . . . . . . . 62

*Частка трэцяя.*
НА ВЫСОКІХ БЕРАГАХ АБЛОКАЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . 68

*Частка чацвёртая.*
НА ЗЯМЛІ І Ў ЗАВОБЛАЧНЫХ ВЫШЫНЯХ . . . . . . . . . . . 115

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157